Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзмена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 15. Варыянт 3. Ч.1**

**Білет 15. Практычныя заняткі. БССР у гады новай эканамічнай палітыкі**

**Заданні склала:**Касьян Уладзімір Уладзіміравіч, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства ДУА "Сярэдняя школа №8 г.Мазыра"

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. Як называецца грашовая адзінка, намаляваная на ілюстрацыі? Раскажыце, што вам пра яе вядома?
2. Растлумачце, аб чым сведчыла з'яўленне чырвонца ў эканоміцы савецкай дзяржавы?
3. Як вызначалася сума натуральнага падатку і якія магчымасці для развіцця сялянскай гаспадаркі давала яго ўвядзенне?
4. Дакажыце, што замена харчразвёрсткі харчовым падаткам садзейнічала ўстанаўленню ў краіне капіталістычных адносін.

**Крыніца I**
**Залаты чырвонец «Сеятель» 1923 г.**




**Крыніца II**
**З пастановы УЦВК аб замене харчовай і сыравіннай развёрсткі натуральным падаткам. 21 сакавіка 1921 г.**

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі
«2. Гэты падатак павінен быць менш накладае да гэтага часу шляхам разверсткі абкладання. Сума падатку павінна быць вылічана так, каб пакрыць самыя неабходныя патрэбнасці арміі, гарадскіх рабочых і незямлеробскага насельніцтва.
3. Падатак спаганяецца ў выглядзе працэнтнага або долевага адлічэння ад выраблених у гаспадарцы прадуктаў, зыходзячы з уліку ўраджаю, колькасці едакоў у гаспадарцы і наяўнасці жывёлы ў ім.
4. <...> працэнт вылічэння для гаспадарак серадмякоў, маламагутных гаспадароў і для гаспадарак гарадскіх рабочых павінен быць паніжаным. Гаспадаркі найбяднейшых сялян могуць быць вызваляемыя ад некаторых, а ў выключных выпадках і ад усіх відаў натуральнага падатку.
8. Усе запасы харчавання, сыравіны і фуражу, якія застаюцца ў земляробаў пасля выканання імі падатку, знаходзяцца ў поўным іх распараджэнні і могуць быць выкарыстоўваныя імі для паляпшэння і ўмацаванні сваёй гаспадаркі, для павышэння асабістага спажывання і для абмену на прадукты фабрычна-завадской і саматужнай прамысловасці і сельскагаспадарчай вытворчасці. <...>

**Крыніца III**
**З даклада «Новая эканамічная палітыка і задачы палітпрасветаў» У.І. Леніна на II Усерасійскім з'ездзе палітпрасветаў ад 17 кастрычніка 1921 г.**

«Новая эканамічная палітыка азначае замену развёрсткі падаткам, азначае пераход да аднаўлення капіталізму ў значнай меры. У якой меры - гэтага мы не ведаем... знішчэнне развёрсткі азначае для сялян свабодны гандаль сельскагаспадарчымі лішкамі, не ўзятымі падаткам, а падатак бярэ толькі невялікую долю прадуктаў. Сяляне складаюць гіганцкую частку ўсяго насельніцтва і ўсёй эканомікі, і таму на глебе гэтага свабоднага гандлю капіталізм не можа не расці…»

**Адказы:**
1. На ілюстрацыі намаляваны савецкі чырвонец, які быў уведзены ў грашовае абарачэнне ў перыяд новай эканамічнай палітыкі (1922 г.). Гэтая грашовая адзінка была роўная дарэвалюцыйнай 10-рублёвай манеце і каштавала на сусветным рынку да сярэдзіны 1926 г. больш за 5 долараў ЗША. Чырвонец вырабляўся з золата і мог замяняцца папяровымі грашыма.
2. З'яўленне савецкага чырвонца сведчыла аб таварна-грашовых адносінах у кіраванні эканамічнымі справамі. Пасля ўвядзення харчовага падатку сяляне маглі свабодна прадаваць сельскагаспадарчыя лішкі на рынку з абаротам новай грашовай адзінкі. Гэта сведчыць аб тым, што чырвонец быў сустрэты насельніцтвам з даверам. Дзякуючы гэтаму курс чырвонца заставаўся стабільным, што дало трывалую глебу для разгортвання новай эканамічнай палітыкі.
3. Згодна з дэкрэтам сума падатку павінна быць вылічана так, каб пакрыць самыя неабходныя патрэбнасці арміі, гарадскіх рабочых і незямляробчага насельніцтва. Падатак, які спаганяецца, залежаў ад гаспадарак насельніцтва. Для серадмякоў, маламагутных і гарадскіх жыхароў падатак быў паніжаны. Найбяднейшыя сяляне маглі быць вызваленыя ад некаторых ці ўсіх відаў натуральнага падатку. Таксама долевае адлічэнне залежала ад ураджаю, колькасці едакоў і наяўнасці жывёлы.

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

Увядзенне харчовага падатку стымулявала дробнатаварную сялянскую гаспадарку. Лішкі прадукцыі, якія заставаліся ў сялян пасля выплаты падаткаў, яны маглі свабодна прадаваць на рынку.

4. «Знішчэнне развёрсткі азначае для сялян свабодны гандаль сельскагаспадарчымі лішкамі». Зыходзячы з гэтага, можна зрабіць выснову, што замена развёрсткі харчовым падаткам давала сялянам магчымасць мець сельскагаспадарчыя лішкі, якія маглі быць выкарыстаны ў інтарэсах сялян. Іх яны маглі абмяняць ці ж прадаць. Продаж лішкаў даваў сялянам магчымасць зарабіць. Як следства, атрыманыя сродкі станавіліся асновай дзяржаўнага бюджэту, што спрыяла станаўленню капіталізму.